ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (815) ● Чацвер, 27 мая 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

## АГІТАТАР—ДАРУЧЭННЕ ПАРТЫЙНАЕ

Работа агітатара — справа даволі важная і далёка не простая. Наша галоўная задача — даводзіць да ведама насельніцтва важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўрада, прапагандаваць вялікія ідэі камуністычнага будаўніцтва. У цяперашніх умовах гэта задача набывае канкрэтны змест — прапаганда ідэй і рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ. Формамі нашай работы могуць быць як індывідуальныя гутаркі, так і мерапрыемствы, якія праводзяцца ўсім калектывам.

Не менш важны і другі бок нашай работы — арганізацыйны. Ад добрасумленнасці кожнага агітатара залежыць, ці будуць правільна і своечасова складзены спісы выбаршчыкаў, ці ўсе яны атрымаюць запрашэнні ўдзельнічаць у выбарах.

Ужо ў першыя тыдні работы агіткалектыву праявіліся розныя адносіны з боку агітатараў да гэтага адказнага даручэння. Калі, напрыклад, агітатары матфака добрасумленна правялі дзяжурства ў агітпункце, то агітацыйная брыгада хімфака проста сарвала яго. Не ўсюды здавальняючыя справы са складаннем спісаў выбаршчыкаў: хімікі і філолагі ставяць складанне і праверку спісаў пад пагрозу зрыву.

Неабходна ўсім агітатарам глыбока ўсвядоміць адказнасць ускладзенай на іх задачы. Тым больш, што выбарная кампанія ўступіла ў рашаючую фазу і патрабуе ад усіх агітатараў актыўнасці і гранічнай зладжанасці ў выкананні любога даручэння.

* * *

Перадвыбарная кампанія цяпер у самым разгары. Агіткалектыў БДУ, які налічвае звыш 60 супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў шасці факультэтаў, зрабіў ужо значную работу: складзены, надрукаваны і вывешаны спісы выбаршчыкаў, арганізавана творчая сустрэча артыстаў Тэатра юнага гледача з выбаршчыкамі, праведзен рад арганізацыйных мерапрыемстваў.

24 мая агіткалектыў БДУ сумесна з агітатарамі іншых калектываў нашай акругі арганізавалі сустрэчу выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Чыгуначнай выбарчай акрузе Аляксандрам Пятровічам Горбачам. На наступным тыдні адбудзецца сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатамі ў гарадскі і раённы Саветы.

На агітпункце наладжана штодзённае дзяжурства агітатараў. Тут устаноўлены тэлефон і тэлевізар. Выбаршчыкі могуць пачытаць свежыя газеты і часопісы, юрыдычную і палітычную літаратуру. Рэгулярна праводзяцца юрыдычныя кансультацыі, лекцыі і гутаркі па актуальных пытаннях унутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкага ўрада. Пры агітпункце працуе кіназала, дзе наладжана дэманстрацыя фільмаў.

Л. ЛОЙКА.

## У АЎДЫТОРЫІ І ЗА ЯЕ МЕЖАМІ

РАШЭННІ XXIV З'ЕЗДА — У ЖЫЦЦЁ

Дакументы і матэрыялы XXIV з'езда КПСС ляжаць у аснове ўсёй вучэбна - выхаваўчай і прапагандысцкай работы кафедры навуковага камунізму. Дастаткова сказаць, што толькі за перыяд з сакавіка па 7 мая 1971 г. адбылося 4 пасяджэнні кафедры, на якіх разглядаліся пытанні, звязаныя з рашэннямі XXIV з'езда КПСС.

Ужо 12 сакавіка 1971 года кафедра абмеркавала пытанне «Аб вывучэнні са студэнтамі праекта Дырэктыў па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гг.» Адпаведна прынятаму рашэнню для студэнтаў IV курса ўсіх факультэтаў у перыяд да 25 сакавіка 1971 г. была прачытана лекцыя і праведзены двухгадзінныя семінарскія заняткі; план семінара быў загадзя складзен і зацверджан на пасяджэнні кафедры.

9 красавіка на чарговым пасяджэнні быў распрацаван і зацверджан разгорнуты «План мерапрыемстваў кафедры навуковага камунізму ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС». Прадугледжаныя ў ім мерапрыемствы строга праводзяцца ў жыццё, за іх здзяйсненнем устаноўлены адпаведны кантроль. Тады ж быў зацверджан і план аглядавых лекцый (куды ўключаны і лекцыі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС) для студэнтаў пятых і шостых курсаў філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі, якія здаюць дзяржаўныя экзамены па навуковаму камунізму.

Затым быў зацверджан загадзя распрацаваны план семінарскіх заняткаў па матэрыялах XXIV з'езда, унесены неабходныя змены ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС у прыкладныя планы семінарскіх заняткаў на 1971-72 навучальны год, якія будуць выдадзены асобнай брашурай. Распрацаваны мерапрыемствы з улікам дакументаў і матэрыялаў XXIV з'езда КПСС, накіраваныя на паляпшэнне нагляднасці выкладання курса навуковага камунізму.

Было вырашана таксама правесці заняткі, прысвечаныя вывучэнню матэрыялаў і дакументаў з'езда партыі, да 1 чэрвеня 1971 года. Гэта рашэнне таксама выканана: заняткі па матэрыялах з'езда праведзены да 22 мая на ўсіх факультэтах дзённых і вячэрніх аддзяленняў.

Акрамя таго, кафедра абмеркавала і рэкамендавала выкладчыкам разгорнутыя тэзісы дзвюх лекцый па матэрыялах XXIV з'езда партыі, пераглядзела ў святле іх рашэнняў тэматыку курсавых і кантрольных работ, унесла адпаведныя змены ў экзаменацыйныя білеты курсавых і дзяржаўных экзаменаў.

Актыўны ўдзел супрацоўнікі кафедры прынялі ў Ленінскім заліку, у правядзенні гутарак і палітінфармацый для студэнтаў па тэматыцы, звязанай з дакументамі і матэрыяламі XXIV з'езда КПСС.

Вялікая работа праведзена кафедрай па прапагандзе рашэнняў XXIV з'езда КПСС сярод працоўных горада і рэспублікі. Па пуцёўках ЦК КПБ з чытаннем лекцый у раёны рэспублікі выязджалі выкладчыкі кафедры, кандыдат філасофскіх навук М. П. Квочкін і кандыдат юрыдычных навук М. Г. Петачэнка. М. П. Квочкін прачытаў 10 лекцый, М. Г. Петачэнка — 7. Па дзве-чатыры лекцыі для прапагандыстаў і працоўных Мінска і вобласці прачыталі доктар філасофскіх навук М. Р. Круцько, дацэнт І. С. Сямыкін, ст. выкладчыкі А. М. Камароў, І. Н. Смальцар, выкладчыкі А. А. Паўловіч, А. Ф. Уколаў, Н. Н. Літоўка, аспірант Ф. І. Варанковіч і іншыя. Усяго па матэрыялах XXIV з'езда КПСС супрацоўнікі кафедры прачыталі 42 лекцыі.

Ва ўсёй вучэбнай і прапагандысцкай рабоце кафедра шырока выкарыстоўвала дакументы і матэрыялы XXVII з'езда КПБ.

П. СІЛІВАНЧЫК,
намеснік загадчыка кафедры навуковага камунізму.

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

**Днямі на факультэце журналістыкі адбылася абарона доктарскай дысертацыі дэканам факультэта, дацэнтам Рыгорам Васільевічам Булацкім на тэму «Ленін і ленінская школа публіцыстыкі». У якасці афіцыйных апанентаў выступілі акадэмік І. С. Краўчанка, прафесары У. Д. Пельт, Ц. Я. Саладкоў. Члены вучонага савета аднадушна адобрылі даследаванне вучонага і павіншавалі Р. В. Булацкага з паспяховай абаронай дысертацыі.**

* * *

**«Навука — пяцігодцы» — так называецца кніжная выстаўка, якая адкрыта ў бібліятэцы галоўнага корпуса. Супрацоўнікі бібліятэкі з густам афармілі яе, падабралі цікавыя выданні, такія, як «Ленін і сучасная навука», «Ленін і сучасныя праблемы тэорыі пазнання», «Навука сёння», «Сучасная навукова-тэхнічная рэвалюцыя», «Ленінскі план сацыялістычнай індустрыялізацыі і яго ажыццяўленне», «Кібернетыка чакаемая, кібернетыка нечаканая» і шмат іншых.**

* * *

**Ва ўсіх групах і на патоках факультэта прыкладной матэматыкі прайшлі справаздачна - выбарныя камсамольскія сходы. З прынцыповай дзелавітасцю студэнты абмеркавалі свае справы за мінулы навучальны год. Было адзначана многа станоўчага, новага ў рабоце. Асабліва ўважліва разгледжаны недахопы.**

**У састаў бюро, выбраных на сходах, увайшлі найбольш дзелавыя, актыўныя камсамольцы.**

**М. ПЯТРОВІЧ.**

# БДУ—ІМЯ ГАНАРОВАЕ

*(Працяг. Пачатак у № 19).*

### На гасціннай казачнай зямлі

Нясвіж — горад-легенда, горад-казка. Глыбокай старажытнасцю вее ад сцен замка — былой рэзідэнцыі князёў Радзівілаў. Стаіць замак на востраве і чацвёрты век глядзіць у цёмныя азёрныя воды. Каб патрапіць у яго, трэба прайсці плацiну, потым — арачны мост і вароты з вартаўнічай вежай. У цудоўных залах, дзе раней да самага ранку гучала музыка і піравалі князі-магнаты, цяпер адпачываюць працоўныя — рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя.

У горадзе да нашых дзён захаваўся белы каменны дом з маленькімі вокнамі ў тоўстых сценах. Амаль 400 год мінула з таго часу, калі над драўляным друкарскім станком завіхаўся выдатны асветнік і вучоны Сымон Будны. Тут друкаваў ён свае кнігі. У сценах гэтага дома нарадзіўся «Катэхізіс» на беларускай мове.




Выдатны помнік архітэктуры — касцёл, выканан у стылі барока. На таблічцы надпіс: «Помнік архітэктуры ўсесаюзнага значэння. Фарны касцёл 1593 г. Архітэктар Ян Марыя Бернардоні».

Набожны і чванлівы князь, валодаючы незлічонымі багаццямі, выпісаў архітэктара з Італіі. Будавалі ж касцёл прыгонныя сяляне. Не адзін год тысячы прыгонных працавалі на будаўніцтве пад наглядам гайдукоў, выконваючы ўсе работы ўручную. Прайшлі вякі, а касцёл стаіць, не крануты часам. Стаіць як помнік працы чалавечых рук, яго розуму і сілы.

У Нясвіжы ў настаўніцкай семінарыі вучыўся народны паэт Беларусі Якуб Колас, а пазней — пісьменнік Кузьма Чорны.

Такі Нясвіж — горад-легенда, які пакінуў у нас незабыўныя ўспаміны і ўражанні. Мы доўга з асалодай хадзілі па яго казачных мясцінах, слухалі расказы аб старажытнай гісторыі аднаго з цудоўнейшых куткоў зямлі беларусаў. Нясвіжцы ганарацца сваім горадам, расказваюць аб ім ахвотна і цікава.

Кранула сустрэча нясвіжцаў, іх гасціннасць, адносіны да універсітэта і нас, яго прадстаўнікоў.

У райкоме партыі нас сустракала другі сакратар Марыя Аляксандраўна Бабіч. З адкрытай, цёплай усмешкай вітала кожнага ўдзельніка агітрабегу «БДУ-50». Першыя яе словы былі аб універсітэце: «Сустракаць вас мне асабліва радасна. Я таксама выпускніца Беларускага універсітэта, якому ўдзячна на ўсё жыццё...».

Марыя Аляксандраўна расказвае аб горадзе, раёне. Расказвае з гонарам і любоўю. А сказаць ёсць аб чым — раён мае добрую рэпутацыю. У мінулым годзе ў сярэднім з аднаго гектара было сабрана па 24 цэнтнеры збожжа. Вялікі даход дае жывёлагадоўля, мясцовая прамысловасць. Мы сустракаліся з рабочымі райпрамкамбіната, калгаснікамі сельгасарцелі «Радзіма» і маглі назіраць усё ўласнымі вачыма.

У калгасе «Радзіма» па-сапраўднаму адчуваецца вялікая ўвага да працоўнага чалавека. У чырвоным кутку жывёлаводаў — тэлевізар, радыёпрыёмнік, падшыўкі газет і часопісаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

# ПАДРЫХТОЎЧАМУ—10 ГОД

## ШЧАСЦЕ—УСІМ ЛЮДЗЯМ

Нам пашанцавала: мы — дзесяты выпуск!

Як толькі мы прыехалі ў гасцінны Мінск, нас сустрэлі вельмі цёпла. Усюды і ва ўсім мы адчуваем добразычлівасць: і ў інтэрнаце, і ва універсітэце, і на вуліцах.

Мы ўжо пабывалі ў дзіцячых садах, у школах, у музеях. Мы ўбачылі, як шчасліва жывуць савецкія дзеці. Але мы ўпэўнены, што і над нашай краінай таксама будзе чыстае неба, што і нашы дзеці будуць шчаслівымі. Шчаслівае ж дзяцінства савецкіх людзей нараджалася таксама ў цяжкасцях. У музеях, у кіно мы бачылі, як беларускі народ разам з усім савецкім народам падняўся на барацьбу з фашызмам. У гэтым многа агульнага паміж намі. Розніца толькі ў тым, што ў вас вайна даўно скончылася, а наша параненая зямля яшчэ ўздрыгвае ад узрываў бомб.

Мы вядзем справядлівую вайну. У нашай барацьбе нам дапамагаюць сябры. Вялікую дапамогу аказвае і Савецкі Саюз, верны друг в'етнамскага народа.

Мы вельмі рады, што прыехалі вучыцца ў краіну сяброў, у Савецкі Саюз, у краіну перадавой навукі і тэхнікі, у краіну вялікага Леніна. Мне цяпер асабліва сталі зразумелы словы савецкага паэта Маякоўскага: «Да будь я и негром преклонных годов, и то без унынья и лени я русский бы выучил только за то, что им разговаривал Ленин!»

Займаючыся на падрыхтоўчым факультэце, мы многа і ўпорна вывучаем рускую мову, бо гэта ключ да авалодання нашай будучай спецыяльнасцю, ключ да ведаў. Вялікую дапамогу ў вучобе аказалі нам выкладчыкі.

Мне хочацца пажадаць усім моцнага здароўя, шчасця, поспехаў.

**Во Тхі Хонг В'ет,**
**студэнтка падрыхтоўчага факультэта**



*Выпускнікі Мінскага медыцынскага інстытута, якія ў свой час вучыліся на падрыхтоўчым факультэце БДУ.* Фота *М. Нечыпарэнкі.*

## СТУДЭНЦКІ СПАДАРОЖНІК

Ў ЮБІЛЕЙНЫ ГОД падрыхтоўчага факультэта насценгазета «Дружба» таксама можа па праву лічыць сябе юбілярам. Усе 10 год работы факультэта па навучанню замежных грамадзян насценгазета «Дружба» была верным сябрам і спадарожнікам студэнтаў. Накіраванасць газеты, змест усіх яе нумароў поўнасцю адпавядалі і адпавядаюць назве — «Дружба».

Студэнты ў сваёй газеце гавораць аб глыбокай удзячнасці савецкаму народу, аб тым, што бясконца рады магчымасці вучыцца на радзіме У. І. Леніна і вывучаць мову, на якой гаварыў Ленін.

Многа артыкулаў студэнты прысвячаюць пытанням вучобы і, як правіла, не забываюць сказаць і аб той дапамозе, якую аказваюць іх добрыя сябры — савецкія студэнты. У гэтых артыкулах адчуваецца разуменне сапраўднага інтэрнацыяналізму савецкіх людзей, іх бескарыснай дапамогі народам-братам. І моладзь, прыехаўшая да нас вучыцца з розных краін свету, выказвае шчырае пачуццё ўдзячнасці савецкаму народу, савецкаму ўраду.

Студэнты падрыхтоўчага факультэта жывуць цікавым жыццём і ахвотна пішуць у сваю газету як аб вучобе, так і аб тым, як знаёмяцца з савецкай рэчаіснасцю, пішуць аб найбольш памятных сустрэчах з савецкімі людзьмі — працаўнікамі вытворчасці і чакаюць новых сустрэч. Расказваючы аб экскурсіях на мінскія заводы, яны захапляюцца размахам і зладжанасцю вытворчасці, умовамі працы і адпачынку нашых савецкіх рабочых. Студэнты вельмі любяць сустрэчы з рабочымі, заўсёды імкнуцца пагутарыць з імі, задаюць многа пытанняў. І ў гэтых гутарках, як правіла, выказваецца глыбокая ўзаемная сімпатыя, сяброўскія адносіны.

Але, як пішуць у сваіх артыкулах нашы карэспандэнты, найбольш моцнае ўражанне на іх аказваюць экскурсіі ў дзіцячыя ўстановы — школы і дзіцячыя сады, дзе яны пераконваюцца ў тым, якія клопаты аб савецкіх дзецях праяўляюць Камуністычная партыя і Савецкі ўрад.

«Вялікую радасць прынесла нам наведанне дзіцячага сада. Тут малых вучаць маляваць, танцаваць, спяваць, расказваць казкі, дэкламаваць вершы. Аб іх нястомна клапоцяцца. Дзеці падарылі нам простыя, але вельмі забаўныя падарункі, зробленыя сваімі рукамі. Мы былі вельмі ўсхваляваны. Шкада было развітвацца з маленькімі сябрамі, хацелася пабыць з імі яшчэ больш. Надвор'е ў гэты дзень было прахладнае, але на душы ў кожнага з нас было цёпла», — піша Чан Суан Там.

У вольны ад вучобы час студэнты наведваюць музеі, кінатэатры, цырк, робяць экскурсіі па месцах баявой славы беларускага народа, слухаюць цікавыя лекцыі, прымаюць удзел у студэнцкіх вечарах. Усе гэтыя моманты іх жыцця знаходзяць сваё адлюстраванне ў газеце «Дружба».

Незабыўнае ўражанне пакідае ў студэнтаў штогадовая экскурсія ў Брэсцкую крэпасць. Наведаўшы крэпасць-герой, кубінскі студэнт Фаусто Бонэ пісаў: «Да пабачэння, Брэсцкая крэпасць! Я не ведаю, калі яшчэ сустрэнуся з табой. Але я не забуду цябе ніколі, таму што ты, Брэсцкая крэпасць, і ўсе загінуўшыя за шчасце чалавецтва заўсёды будуць у маім сэрцы, у маім жыцці. Гераізм тваіх сыноў натхняў нас на барацьбу за свабоду маёй радзімы — Кубы, усяляў у нас надзеі, нараджаў мужнасць у гэтай барацьбе!»

Студэнты падрыхтоўчага факультэта, як і ўсе студэнты ў свеце, любяць спяваць, танцаваць, чытаць вершы. Аб мастацкай самадзейнасці факультэта ў артыкулах «Наш хор» і «Агляд мастацкай самадзейнасці» студэнты пісалі: «...Агляд прайшоў, як свята. Мы ўсе адчулі, што рыхтаваліся не дарэмна. Мы вельмі ўдзячны кіраўніцтву падрыхтоўчага факультэта за тое, што нам створаны ўсе магчымасці, каб займацца музыкай, спевамі, танцамі. На факультэце створан добры хор». (Нгуен Ан Мінь, Во Тхі В'ет).

Нядаўна на факультэце быў праведзен традыцыйны вечар рускай мовы. Да яго студэнты рыхтаваліся доўга і сур'ёзна. І прыемна было пераканацца, што яны дабіліся добрых вынікаў. На вечары гучала правільная руская мова: юнакі і дзяўчаты расказвалі вершы і спявалі песні аб Савецкай Расіі. Вечар прайшоў вельмі цікава і пакінуў у студэнтаў пачуццё вялікага задавальнення. Гэты настрой яны выказалі ў сваіх водгуках аб вечары, напісаных для газеты «Дружба».

Студэнты вучацца на падрыхтоўчым факультэце толькі адзін год, але паўнакроўнае жыццё ў адзінай дружнай сям'і факультэта, напоўненае ўпорнай працай, цікавымі падзеямі, сустрэчамі, пакідае ў памяці студэнтаў глыбокі след. І яны звяртаюцца ў нашую газету са словамі сыноўняй падзякі факультэту: «Хутка мы закончым падрыхтоўчы факультэт і будзем працягваць вучобу ў розных кутках СССР, а некаторыя застануцца ў Мінску. Але ніхто з нас не забудзе родны факультэт і Мінск. Мы заўсёды будзем памятаць наш факультэт і нашых сяброў». (Нгуен Ван Тха. 11 група).

«Мы ўдзячны кіраўніцтву падрыхтоўчага факультэта, усім выкладчыкам. Цяпер мы вучымся ў розных вну рэспублікі і Саюза і заўсёды стараемся добра вучыцца, каб не падвесці наш факультэт. Нашы поспехі ў вучобе — гэта вынік работы нашых выкладчыкаў». (Група студэнтаў IV курса).

«Нашы выкладчыкі вельмі добрыя і чулыя. Яны хочуць, каб мы адчувалі сябе тут добра, хочуць даць нам глыбокія веды. Яны вучаць нас не спыняцца перад цяжкасцямі...». (Ву Тхі Хонг. 4 група).

**Т. ПЯТРОВІЧ,**
**ст. выкладчык, рэдактар газеты «Дружба».**

## ЗА МІР, ЗА ДРУЖБУ

23 мая вечарам зялёны тэатр парка культуры і адпачынку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка запоўнілі юнакі і дзяўчаты, трактаразаводцы, жыхары прылягаючага мікрараёна. Вечар інтэрнацыянальнай дружбы адкрыў беларускі пісьменнік Алесь Кучар. Ён расказаў аб барацьбе савецкага народа за мір, аб паспяховым будаўніцтве камунізму, аб дапамозе народам-змагарам.

Затым слова ўзяла студэнтка падрыхтоўчага факультэта БДУ імя У. І. Леніна з Паўднёвага В'етнама Хоанг Ань Фыонг. Яна гаварыла аб барацьбе моладзі і народа Паўднёвага В'етнама за свабоду і незалежнасць, аб будаўніцтве сацыялізму ў ДРВ. Студэнтка філалагічнага факультэта БДУ француланка Жані Маганьоск і студэнт матэматычнага факультэта з Венесуэлы Арханхел Бессерра прысвяцілі свае выступленні ўмацаванню дружбы паміж народамі, барацьбе моладзі за мір, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс, падзяліліся ўражаннямі аб вучобе і жыцці іншаземных студэнтаў у Савецкім Саюзе.

У заключэнне адбылася вялікі канцэрт.

**М. ДЗЯДКОВА.**

*В'етнамскія студэнты БДУ з вялікай цікавасцю знаёмяцца з жыццём савецкіх дзяцей, наведваюць школы, дзіцячыя сады, палацы піянераў. Беларускія хлопчыкі і дзяўчынкі шчыра сустракаюць маладых прадстаўнікоў гераічнага В'етнама.*

*НА ЗДЫМКУ: в'етнамскія студэнты ў Мінскім Палацы піянераў і школьнікаў.*

*Амаль ва ўсіх жанрах дэманструюць сваё майстэрства в'етнамскія студэнты. Граматай фестывалю, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, узнагароджан танцавальны калектыў.*

Фота *М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*





Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 671. АТ 15002